# Сінтаксіс простага сказа

1. Сутнасць намінатыўнай будовы сказа.
2. Тыпы простых сказаў.
3. Сродкі выражэння галоўных члена сказа.
4. Дапасаванне дзейніка і выказніка.

# 1 Сутнасць намінатыўнай будовы сказа

У сказе *дзейнік* пры дзеяслоўным выказніку заўсёды меў (і мае) форму ***назоўнага*** склону,

чым адрозніваўся ад *дапаўнення*, якое выступала ва *ўскосных* склонах.

*Двухсастаўныя* сказы

дзейнік і выказнік:

***побі мразъ обилье по волости***

З ***аднасастаўных*** сказаў распаўсюджаны ***пэўна-асабовыя*** сказы адсутнічаў дзейнік, а ў галоўным члене-дзеяслове выражалася пэўная асоба. Пашыранасць гэтых сказаў абумоўлена адсутнасцю займеннікаў 1-2 асобы ў ролі дзейніка і выражэннем асобы ў форме дзеяслова:

*почьто* ***идеши*** *опѧть* ***поималъ еси*** *всю дань.*

# **Безасабовыя** сказы

У якасці галоўных членаў:

- дзеяслоў *достоить* (заменены словам *следует*);
- дзеясловы са значэннем стыхійнага ўзнікнення: *лучитисѧ, загорѣтисѧ*;
- дзеясловы, якія называлі стыхійныя з’явы: *морозити*;
- дзеясловы са значэннем псіхічнага стану: *мнитисѧ, видитисѧ, погрѣшитисѧ.*

У помніках XVII ст. сустракаецца ***безасабова-ініфінітыўныя*** канструкцыі з прэдыкатыўным прыслоўем на -о:

*тѧжько слышати ушима а очима видѣти;*

*тьмьно бо бѣ в .г. дьнь.*

У безасабовых канструкцыях выступаў у якасці галоўнага члена дзеепрыметнік залежнага стану ніякага роду:

*писано бо ѥсть; приказано бысть.*

**Намінатыўныя** сказы

загалоўкі ці зачыны

ў граматах:

*правьда русьская*

# 3 **Сродкі выражэння галоўных членаў сказа**

У двухсастаўных сказах **дзейнік** выражаўся:

- назоўнікам:

  *кнѧзь мѣрилъ мо по леду*

- займеннікам:

  *кто же дрьзнеть сътворити се;*

- прыметнікам:

  *<u>злии</u> радовахуса не даша ѥмоу живущии тоу*

- лічэбнікам у спалучэнні з назоўнікам:

*<u>дъва сълньца</u> помьркоста*

- лічэбнікам у спалучэнні з назоўнікам:

*дъва сълньца* *помьркоста*;

- спалучэннем назоўніка ў форме назоўнага склону з назоўнікам ў форме творнага склону:

*андрѣ съ смолѣны*;

- няпэўна-колькаснымі словамі *мьного, мало, колико* з назоўнікам у форме роднага склону множнага ліку:

*<u>мало людии</u> начяша приходити.*

- лічэбнікам *сорокъ*, якi яшчэ ў XVI ст. мог мець азначэнне:

*пословъ тотъ <u>сорокъ</u> въ литву*

- займеннікамі 1-2 асобы, калі на іх падаў лагічны націск:

\- для выражэння супрацьпастаўлення:

*мы собѣ будемъ а ты собѣ*,

-у традыцыйным зачыне грамат:

# **Просты дзеяслоўны** выказнік

выражаўся формамі розных часоў і ладоў.

**Дзеяслоўна-інфінітыўны** выказнік –

спрагальная форма дзеяслова + інфінітыў другога дзеяслова.

Спрагальнай формай дзеяслова выражаліся дзеясловы, якія называлі магчымасці, жаданні, імкненні: *думати, мечтати, предполагати, решити.*

У **іменным** выказніку звязка ***быти*** выступала ў прошлым, будучым і ў цяперашнім часе.

Беззвязачныя канструкцыі:

***кънѧзи позвани;***

***намъ ѥсте не братья*.**

# Склонавая форма *імя* ў іменным выказніку

Для больш старажытных помнікаў характэрна форма **назоўнага прэдыкатыўнага**:

*ты имь будешь* ***начальникъ***.

# Развіццё **творнага прэдыкатыўнага**

*хто буде игуменомъ*

- раней у назоўніках пры знамянальных дзеясловах,

затым – пры звязцы *быти*.

*Творны* прэдыкатыўны

***пераменная*** (выпадковая) прыкмета дзейніка,

*назоўны* прэдыкатыўны

прыкмета ***пастаянная***.

# *Кароткія* прыметнікі ў іменным выказніку

выступалі ў форме *назоўнага* прэдыкатыўнага: *кто будетъ* ***виноватъ***.

У іменным выказніку **поўныя** прыметнікі сталі выражаць ***пастаянную*** прыкмету, а **кароткія** – ***часовую***.

У беларускай мове ў большасці выпадкаў ужываюцца поўныя прыметнікі.

# Іменная частка састаўнога выказніка кароткія дзеееепрыметнікі незалежнага стану

*-будете мирно* ***живуще***.

Кароткія дзеепрыметнікі пры розных знамянальных дзеясловах

*дзеепрыметны зварот* ← страта дапасавання дзеепрыметніка да дзейніка, адміранне скланення кароткіх дзеепрыметнікаў, узмацненне дзеяслоўнасці дзеепрыметнікавых формаў: ***слышавъше же то кънѧзи поидоша за днѣпръ.***

# 4 **Дапасаванне дзейніка і выказніка**

- па сэнсе – пры дзейніках, выражаных зборнымі назоўнікамі, выказнік мог ставіцца ў множным ліку:

***побѣдиша ярослава мордва;***

***рекоша дружина***

(3 асоба, множны лік, аорыст).

Выказнік множнага ліку пры дзейніку ў форме адзіночнага ліку магчымы, бо дзейнік-зборны назоўнік абазначаў сукупнасць людзей, іх множнасць.

Дапасаванне трымалася да XVIII ст.

# Разнастайнасць сінтаксічных канструкцый у структуры простага сказа

1. Канструкцыі з *двайнымі ўскоснымі склонамі* як асаблівасць старажытнарускага сінтаксісу.
2. Асаблівасці ўжывання сінтаксічнай канструкцыі “*давальны самастойны*”.
3. Асаблівасці старажытнарускага кіравання.
4. Катэгорыя прыналежнасці, канструкцыя «*інфінітыў + форма назоўнага склону адзіночнага ліку назоўнікаў жаночага роду на -а*» і выражэнне адмоўя.

## 1 Канструкцыі з *двайнымі ўскоснымі склонамі* як асаблівасць старажытнарускага сінтаксісу

*Двайны вінавальны* –

2 формы вінавальнага склону імя, дзе 1 абазначала прамы аб’ект,

а 2 знаходзілася ў прэдыкатыўных адносінах з 1-м вінавальным:

*Постави Мефодия єпископа*

Канструкцыі з *другім вінавальным*, як і з творным прэдыкатыўным, сустракаюцца ў сказах з пераходнымі дзеясловамі называння, успрымання, пачуцця.

У ролі другога вінавальнага выступалі назоўнікі, прыметнікі, дзеепрыметнікі.

Да XVI ст. ***творны прэдыкатыўны*** стаў пераважаць над другім вінавальным, а ў XVII ст. другі вінавальны знік.

# *Двайны давальны*

– 2 формы давальнага склону імя,
2 тыпы:
1 – другі давальны далучаўся непасрэдна да першага давальнага ў простым сказе;
2 – другі давальны далучаўся да першага з дапамогай інфінітыва, з’яўляўся прэдыкатыўным прыдаткам і меў прэдыкатыўнае значэнне:

***Яко быти намъ рабомъ.***

***Повелѣ имь готовымъ быти.***

Да XVIII ст. *другі давальны* выцесніўся ***творным прэдыкатыўным***.

## 2 Асаблівасці ўжывання сінтаксічнай канструкцыі “давальны самастойны”

- форма давальнага склону назоўніка ці займенніка + дзеепрыметнік у форме давальнага склону,
- значэнне прычыны ці часу, перакладаецца даданым сказам прычыны або часу:

*Сразившема сѧ полкома и побѣди ярополкъ*

калі пабіліся абодва войскі, перамог Яраполк

# 3 Асаблівасці старажытнарускага кіравання

***Родны*** склон меў часавае значэнне:

*тои же осени много зла сѧ створи.*

- крыніца слова ***сёння*** (*сего дьня*).

Значэнне страчана, на месцы *роднага* часу ўжываецца:

- ***творны*** склон без прыназоўніка: *той восенню,*
- ***вінавальны*** з прыназоўнікам: адвербіялізаванае спалучэнне *увосень*

# ***Родны*** цэлага

пры займенніках *къто, чьто, которъ* ужываўся на месцы сучаснага ***роднага*** склону з прыназоўнікам *з:*

*къто насъ будетъ живъ*

***Родны*** склон ужываўся і пры дзеясловах *працяглага* ўспрыняцця:

*Позримъ синего Дону;*

*того собрания слушалъ.*

У канструкцыях зараз ужываецца ***вінавальны*** склон з прыназоўнікам або без яго: *паглядзець на Дон,*

*паслухаць той сход*.

У родным склоне на месцы беспрыназоўнікавай канструкцыі ўзнікла спалучэнне з прыназоўнікамі *ад, да* (*ад Кіева, да горада*),

у месным склоне – з прыназоўнікам *у* (*у Кіеве*).

У *давальным* склоне беспрыназоўнікавая канструкцыя + прыназоўнікавая.

Спалучэнне без прыназоўнікаў – рух з заходам у пункт, прыназоўнікавая – без заходу:

*иде мьстиславъ кыѥву* (у Кіеў);

*придеше новугороду* (у Ноўгарад);

*прииде къ царюграду олегъ и грѣци замкоша судъ градъ затвориша*

(Алег у Царград не папаў).

Адрозненні ў значэнні канструкцыі → беспрыназоўнікавы давальны – вінавальны + прыназоўнік *в* (у).

Канструкцыя з давальным прыназоўнікавым –

спалучэнне прыназоўніка *да* з родным склонам.

Давальны прыналежнасці:

*копьѥ летѣ сквозь оуши коневи*.

Канструкцыя замянілася беспрыназоўнікавым родным

(*вушы каня*).

Беспрыназоўнікавая канструкцыя з *вінавальным* склонам у прасторавым значэнні: *глѣбъ вниде чьрниговъ*.

Зараз ужываецца прыназоўнік *у:*

*у Чарнігаў*.

Вінавальны склон ужываўся без прыназоўніка для абазначэння не цалкам занятага дзеяннем часу:

*азъ утро пошлю позвы*.

# *Творны* часу

ужываўся, калі слова называла любыя прамежкі часу: *приде мартомь*.

Зараз творны часу выступае пры абазначэнні частак сутак ці часін года і часта ўтварэнні адвербіялізуюцца: *ноччу, раніцай, восенню*.

Назвы месяцаў і дзён тыдня ў часавых канструкцыях маюць прыназоўнік:

*у сакавіку, у сераду*.

У старабеларускіх помніках, як і ў сучасных беларускіх гаворках, адзначаюцца канструкцыі тыпу *кастрычнікам, сакавіком*.

# Творны прычыны

замяніўся канструкцыямі роднага склону з прыназоўнікамі

*з-за, з прычыны*

і давальнага склону з прыназоўнікам *дзякуючы*:

***человѣци умирахоу различными недугы***

# *Беспрыназоўнікавае* кіраванне

- родны склон: *отхожю свѣта сего; дошедше волги новгородьци воротиша сѧ;*
- давальны склон: *приде свѧтополкъ кыѥву*;
- месны склон: *заложена бысть свѧтая софия новъгородѣ;*

*седѣ кыѥвѣ.*

Дзеяслоў *воѥвати* ўжываўся з вінавальным склонам і прыназоўнікам *на*:

*Игорь воѥва на печѣнегы*

Дзеяслоў *мьстити* выступаў без прыназоўніка:

*Мьстити брату брата*

# 4 **Катэгорыя прыналежнасці, канструкцыя «інфінітыў + форма назоўнага склону адзіночнага ліку назоўнікаў жаночага роду на -*а*» і выражэнне адмоўя**

# *Катэгорыя прыналежнасці*

два спосабы выражэння:

- канструкцыі з прыналежнымі прыметнікамі

- з родным прыіменным.

Замацаванне роднага прыіменнага ішло праз кантамінацыю 2 спосабаў утварэння катэгорыі прыналежнасці ў адной канструкцыі. Часта ўжывалася форма прыналежнага прыметніка ад імя і роднага – ад прозвішча:

*Дворъ поповъ, дѣти Иванова.*

Зараз захаваліся канструкцыі з прыналежнымі прыметнікамі на *-оў, -аў, -еў, -ін*.

У астатніх выпадках ужываюцца канструкцыі з родным прыіменным.

Канструкцыі з прыналежнымі прыметнікамі з суфіксам *-*j*- з часам былі заменены спалучэннямі з роднымі прыіменным:

***княжь корабль*** *– корабль князя.*

*Канструкцыя «інфінітыў + форма назоўнага склону адзіночнага ліку назоўнікаў жаночага роду на -а»* – прамое дапаўненне ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку назоўнікаў жаночага роду на -а пры інфінітыве:

*слѣдуѥт одна гривьна платити.*

Канструкцыя вядома паўночна-заходнім старажытнарускім помнікам да пачатку XVIII ст.

Першапачаткова ў такіх спалучэннях назоўнік быў дзейнікам,

а *надо, нужьно* – выказнікам.

Словы *надо, нужьно* выступалі ў спалучэнні з інфінітывам. Адбылося аб'яднанне 2 канструкцый:

*Мне надо изба* + *надо строити* =

*надо изба строити.*

# *Выражэнне адмоўя*

Пры наяўнасці пры імені займенніка ці часціцы *ни* пры дзеяслове *не* не ўжывалася:

*никто же зазритъ* – ніхто не убачыць.

Пры двух адмоўных выказніках адзін ужываўся з *не*, другі – з *ні*:

*Волостии не роздавати ни даяти грамотъ.*

Зараз ужываюцца дзве часціцы *ні:*

*валасцей ні раздаваць, ні даваць грамат.*

# Сінтаксіс складанага сказа

1. Фарміраванне складаных сказаў у гісторыі ўсходнеславянскіх моў.
2. Гісторыя складаназалежных сказаў.

# 1 **Фарміраванне складаных сказаў у гісторыі ўсходнеславянскіх моў**

Старажытнаруская мова мела складаназлучаныя і складаназалежныя сказы.

Захоўвалася яшчэ і своеасаблівая структура складанага сказа, дзе адбывалася *нанізванне* аднаго сказа на другі:

*Ылмерь озеро великоѥ из него же озера потечетъ волховъ и втечетъ в озеро великоѥ того озера внидеть устьѥ в море варѧжьскоѥ и по тому морю ити до рима а отъ рима прити по морю у царюграду а отъ царяграда прити в понтъ море въ неже втечетъ днѣпръ рѣка.*

# Аб’яднанне сказаў у складаназлучаныя адбывалася з дапамогай злучнікаў:

*спалучальныя* злучнікі: *и, да (и), а*:

- и: *приде князь ярославъ въ новъгородъ и ради быша новгородьци*;
- да (и): *а истцю своє лице взяти да что с нимь погыбло а того єму желѣти своихъ кунъ*

(скурка куніцы – грашовая адзінка);

# *Супраціўныя* злучнікі *а, но, да, анъ, ано, инъ, ино, и*:

- а: *старыя чти яко отца а молодыя яко братью*;
- но: *тому людьѥ не помогають но самъ платить*;
- анъ: *кнѧзь дмитрии восхотѣ причаститисѧ анъ ѥго тогда кровь пастисѧ изъ обою ноздрию*;
- и: *земля наша крещена и нѣсть у насъ учителя*;

# *Размеркавальныя* злучнікі *ли, или, любо, а любо, либо, то..то*:

- а любо: *Хощу главу свою приложити а любо испити шеломомь Дону*;
- то..то: *то ѥго побиють то онъ побиваѥть ихъ многажды*.

## 2 Гісторыя складаназалежных сказаў

1 складаназлучаныя сказы развіваюцца ў складаназалежныя, калі ў адзін з простых сказаў уводзіцца падпарадкавальны злучнік (Якубінскі);

2 складаназалежныя сказы развіліся са складаных сказаў з “нанізваннем” неаднародных сказаў (Ломцеў). Дадыным становіцца сказ з ускоснай мадальнасцю, які выражае пытанне, жаданне, загад. Калі простыя сказы былі ў раўнапраўных сувязях паміж сабой узнікаў складаназлучаны сказ.

# Бяззлучнікавае падпарадкаванне сказаў:

*Не ходи кнѧже убьють тѧ*

- не хадзі, князь, бо заб’юць цябе.

# Мнагазначнасць падпарадкавальных злучнікаў.

**яко** – дадания дапаўняльныя, выніковы, прычыны, параўнальныя, часу:

*Услышаша яко свѧтополкъ идетъ къ нимъ*;

*яко была на озѣрѣ селегери престависѧ*;

**чьто** – дадаёныя азначальныя (*а чьто поимани люди моя пустити без откупа*), дапаўняльныя (*а что былъ отъялъ братъ твои а то ти кнѧже не надобѣ*), прычыны, мэты.

# *Віды дададаных сказаў у старажытнарускай мове*

Дададаны сказ **_часу_** – *єлма, донележе, дондеже, яко, єгда, когда, коли, коль, докуда, докудова, покамест*:

- єлма царь распусти силу тотарьскую по земли руской воєвати кнѧжениє изшедшиє къ володимеру;
- донележе сѧ миръ состоить молите бога за мѧ

# Даданыя сказы прычыны

- *яко, что, ибо, потому что, для того что, затем что, бо, зане, понеже, оже, яже* :

бѣ москвичь мало понеже не ѥдиною дорогою идѧху

# Даданыя ўмовы

есть ли (если), буде, ежели, коли, аже, оже, аще, аче

ажь убьєть мужь мужа то мьстити брату брата

# Даданыя месца

къде (где, де), иде, идеже

приде на холмъ где стояше перунъ

# Даданыя азначальныя

которыи, яко

не вѣдяхоуть котории суть побѣдили

(*котории* таксама меў значэнне ‘які-небудзь’:

которого кнѧзя хощете и язъ вамъ того дамъ)